# Акцэнт на сваё

***22 красавіка ў Калінкавічах прайшло адкрытае свята народных традыцый «Крыніцы-Фэст». У яго межах адбыліся адразу тры імпрэзы: адкрытая выстава выданняў па народных традыцыях «Ключы-Фэст», адкрыты конкурс фальклору «Фолк-Фэст» і XI абласны конкурс выканаўцаў народных побытавых танцаў «Танц-Фэст "Вытокі"». Арганізатарамі выступілі галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама і Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці.***



Фота Волі СЕМЧАНКА

Вынікі конкурсаў будуць падведзены і абвешчаны пазней, да чэрвеня. А пакуль пройдземся па самых адметных момантах свята. Яно было прымеркавана да 20-й гадавіны Міжнароднай канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003 г.) і 85-годдзя з часу ўтварэння Гомельскай вобласці. Сярод галоўных мэтаў – падтрымка і папулярызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны, адраджэнне традыцый і далучэнне да іх шырокіх колаў грамадства.


Фота Юрыя ЗАРЭЦКАГА

Заключныя мерапрыемствы сабралі ў зале Калінкавіцкага раённага дома культуры больш за 300 ўдзельнікаў з 19-і раёнаў Гомельскай, Магілёўскай, Брэсцкай і Мінскай абласцей, а таксама з беларускай сталіцы. У фае ладзілася выстава выданняў па народных традыцыях «Ключы-Фэст». Свае напрацоўкі прадставілі Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці, Цэнтр культуры і вольнага часу Акцябрскага раёна, Калінкавіцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці, Кармянскі раённы цэнтр культуры і вольнага часу, Любанскі раённы цэнтр культуры. На выставе дэманстраваліся выданні па народных традыцыях рэгіёнаў.

У конкурсах праводзіўся папярэдні адборачны тур, а на калінкавіцкай сцэне ўжо выступалі найлепшыя. Цягам 9-і гадзін свае майстэрства дэманстравалі выканаўцы ва ўзросце ад 7-і да 86-і гадоў – як носьбіты, так і пераймальнікі традыцыйнай культуры, выключна аматары, то-бок непрафесіяналы. *«Такім чынам наладжваецца пераемнасць,* – падкрэслівае Ірына Глушэц, адна з галоўных куратараў свята, сябра журы, метадыст па народных традыцыях, абрадах і фальклоры Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці. – *Раней у нас ладзіўся толькі абласны конкурс побытавых танцаў. А сёлета ён "дарос" да акрытага свята – дадаліся два адкрытыя мерапрыемствы: "Фолк-Фэст" і выстава выданняў "Ключы-Фэст". Мы імкнуліся паказаць нашыя карэнныя традыцыі ў сваім натуральным выглядзе – наколькі гэта магчыма на сцэне. Паспрабавалі накіраваць людзей, каб яны выконвалі сваё, мясцовае, без сцэнічных апрацовак, аранжыровак, сцэнізацыі. Параўноўваць выступы канкурсантаў вельмі цяжка. Калі выдатны ўзровень – я проста стаўлю "дзясятку". Напрыклад, былі шыкоўныя выканаўцы з Брэсцкай вобласці, з Мінска, з Калінкавіцкага, Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Светлагорскага і іншых раёнаў Гомельскай вобласці».*

Акцэнт на сваё – напэўна, так можна было б сфармуляваць галоўную ідэю ўсяго свята. Гэта значыць, засваенне менавіта лакальных узораў выканальніцкай традыцыі. Песні, танцы, гульні, казкі, што прадстаўлялі канкурсанты, пераважна паходзяць з іх вёсак, раёнаў, рэгіёнаў, запісаныя ад мясцовых жыхароў.

Адкрыты конкурс фальклору «Фолк-Фэст» ладзіўся ўпершыню. Народную мастацкую творчасць сваіх рэгіёнаў прадстаўлялі на сцэне людзі розных прафесій, удзельнікі аматарскіх калектываў і аб'яднанняў. Спаборнічалі салісты, дуэты і ансамблі – асобна дзеці, моладзь, дарослыя, а таксама змешаныя калектывы. Геаграфія ахоплівала розныя рэгіёны Беларусі – ад Брэстчыны да Магілёўшчыны. Прыярытэт надаваўся Гомельшчыне – колькасць прадстаўнікоў гэтага рэгіёну не абмяжоўвалася.

Намінацый было шмат: «спевы» (абрадавыя і пазаабрадавыя песні, песенныя карагоды без музычна-інструментальнага суправаджэння), «прыпеўкі», «танцы, скокі», «гульні», «інструментальная музыка» і «творы народнай прозы» (паданні, легенды, казкі, байкі, показкі, загадкі, прымаўкі і г.д.). Калі ў конкурсе танцораў (пра яго – ніжэй) удзельнічалі толькі пары, то на «Фолк-Фэсце» можна было пабачыць таксама сольныя, парна-гуртавыя танцы, карагоды, гульні. Журы ацэньвала выканальніцкае майстэрства, традыцыйную манеру, імправізацыйнасць, захаванне мясцовых традыцый і моўнага дыялекту, а таксама строі – арыгіналы аўтэнтычных касцюмаў або іх дакладныя рэканструкцыі.

Конкурс побытавых танцаў «Вытокі» стаў традыцыйным, ён ладзіцца на Гомельшчыне ўжо 11-ы раз. Сёлета да назвы дадаўся прэфікс «Танц-Фэст». Журы ацэньвала не толькі выканальніцкае майстэрства, веданне кампазіцыі, але і захаванне мясцовага танцавальнага стылю, самабытнасць і адметнасць танцавальнай манеры, строі. Паводле Палажэння конкурсу, удзельнічалі танцоры толькі з Гомельшчыны. У фінале і паўфінале выступілі больш за 60 пар. Яны выконвалі папулярныя побытавыя танцы адпаведна сваёй катэгорыі. Напрыклад, самыя малодшыя танчылі «Базар», «Картузэ», «Карманчыкі», польку «Бабачку», а ў фінале – яшчэ і «Лявоніху». А вось «Какетку», «Кракавяк», «Матлёт», «Месяц», «Каробачку», «Мікіту», «Падыспань», польку «Верацяно» паказвалі старэйшыя ўдзельнікі, падлеткі і моладзь. Сёлета дадалася новая катэгорыя – асобна спаборнічалі пераможцы мінулых гадоў.

Сябра журы конкурсу «Танц-Фэст "Вытокі"» і старшыня журы конкурсу «Фолк-Фэст», вядучы спецыяліст аддзела інфармацыйна-аналітычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алена Каліноўская зазначыла: *«Адметнасць сёлетняй праграмы – актыўны ўдзел школ мастацтваў. Прыемна, што навучэнцы далучаюцца да танцавальных конкурсаў у традыцыйным стылі. Няважна, што яны пачаткоўцы – але вельмі добрасумленыя, натхнёныя. У тым ліку дзеці зусім невялічкага ўзросту – першыя класы, дашкольнікі. З іншага боку, на Гомельшчыне шмат такіх пар, якія стала ўдзельнічаюць у конкурснай праграме, некаторыя і па 10 гадоў. Яны захоўваюць і паляпшаюць свой узровень, становяцца выдатнымі ўзорамі выканальніцкага майстэрства. На такіх конкурсах, як "Вытокі" на Гомельшчыне, і ў шэрагу іншых падобных абласных праектаў выдатна ўвасабляюцца прынцыпы, закладзеныя фестывалем фальклорнага мастацтва "Берагіня"».*

Этнахарэограф, сябра журы, в. а. абавязкі дырэктара Любанскага раённага цэнтра культуры Сяргей Выскварка сочыць за праектам ад самых яго вытокаў: *«Самае важнае – што такі конкурс ёсць, і да яго далучаюцца дзеці, падлеткі. І як жа складана выбіраць сярод іх найлепшых! Калі малодшыя канкурсанты толькі напрацоўваюць майстэрства, то многіх падлеткаў ужо можна лічыць сапраўднымі карыфеямі. Можна прасачыць у іх выступах канкэртную "школу" – педагог пазнаецца ў сваіх вучнях. Бачная індывідуальнасць кожнага танцора: калі яе няма – гэта ўжо не танец, а набор рухаў. У маленькіх дзетак індывідуальная манера яшчэ не так моцна выяўлена, але яскрава прабіваецца ўжо з 13-14 гадоў, асабліва ў хлопцаў. А калі яна дадаецца да "школы" і рэгіянальнай манеры – атрымліваецца сапраўды выдатны танцор».*

Як зазначылі сябры журы, мясцовы танцавальны стыль з года ў год выразна дэманструюць танцоры з Акцябрскага раёна, г.п. Капаткевічы Петрыкаўскага, в. Ліпляны Лельчыцкага раёнаў – яны трымаюцца сваёй манеры і ад яе не адступаюць. Наогул, каб можна было культываваць тую самую «рэгіянальнасць» у побытавыя танцы, вельмі бракуе агульнабеларускіх і лакальных даследаванняў, на якія педагогі, этнахарэографы маглі б абапірацца ў сваёй працы.

Незалежна ад таго, як размяркуюцца прызавыя месцы, – свята адбылося. І гэта галоўная ўзнагарода для яго ўдзельнікаў, гледачоў і арганізатараў. Кожны танцор, спявак ці апавядальнік, незалежна ад узросту, паказаў сваю творчую індывідуальнасць, яскравую харызму, якія арганічна ўпісаныя ў кантэкст традыцыйнай культуры – менавіта сваёй, мясцовай. А значыць, у яе ёсць будучыня.

**Воля СЕМЧАНКА**


Фота Юрыя ЗАРЭЦКАГА